# Кнігадрукаванне ў Беларусі




Да 500-годдзя беларусскага кнігадрукавання

**2017 год**
**Бібліятэка Сенненскай школы-інтэрната**

# Першыя друкарні ў Беларусі

**Першыя рэфармацыйныя друкарні ў Беларусі былі створаны ў Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) у 50-60-я гады XVI ст**. пры падтрымцы пэўнай часткі беларускай і літоўскай магнатэрыі, некаторых слаёў шляхты, якія далучыліся да Рэфармацыі. У адрозненні ад княскага праваслаўнага роду Слуцкіх (Алелькавічаў), якія доўгі час падтрымлівалі грэка-праваслаўную рукапісную традыцыю і беларуска-літоўскае летапісанне, літаратурнае мецэнацтва магнатаў-пратэстантаў было цесна звязана з арганізацыяй еўрапейскага кнігадрукавання (маецца на ўвазе новая жанравая структура выданняў, увага да рэнэсансавай заходнееўрапейскай літаратуры і пісьменнасці, нетрадыцыйнае аблічча друкаванай кнігі ды інш.).

# Першыя друкарні ў Беларусі



Асобая заслуга ў гэтым належыць роду Радзівілаў, перш за ўсё - віленскаму ваяводзе і канцлеру, найбуйнейшаму магнату ВКЛ Мікалаю Радзівілу Чорнаму. Падарожжы за мяжу, знаёмства з мясцовай і еўрапейскай культурай дапамаглі яму ацаніць ролю кнігадрукавання ў царкоўна-рэлігійным, палітычным і культурным жыцьці. Для прапаганды рэфармацыйных ідэяў у 1553 г. у Бярэсце, пры падтрымцы Радзівіла Чорнага была заснаваная першая на тэрыторыі Беларусі друкарня, якая была таксама першай рэфармацыйнай друкарняй у землях ВКЛ.

# Першыя друкарні ў Беларусі



- **Мікалай Крыштаф Радзівіл**, які таксама атрымаў мянушку **Чорны** нарадзіўся 4 лютага 1515 года, на пачатку стагоддзя Рэфармацыі, у якой і сыграў немалаважную ролю, пакінуўшы вялікі след у гісторыі грамадскай і культурнай дзейнасці, а таксама ў справе рэфармавання царквы. Мікалай Радзівіл Чорны, безумоўна, адзін з вядомейшых палітычных дзеячоў нашай радзімы – канцлер Вялікага Княства Літоўскага, ваявода віленскі, заснавальнік нясвіжскай лініі роду Радзівілаў, чалавек, якога называлі некаранаваным каралём Беларусі, апосталам Рэфармацыі.

# Першыя друкарні ў Беларусі



- Пасля смерці Мікалая Крыштафа Радзівіла (Чорнага) адказнысць за развіцце рэфармацыйнага руху на Беларусі бярэ на сябе яго брат - **Мікалай Радзівіл Руды** герой Інфлянцкай вайны, найвышэйшы гетман літоўскі.

# Яны зрабілі значны ўклад у развіццё беларускага кнігадрукавання







# Першадрукары Беларусі



- **Францішак Скарына - беларускі і ўсходнеславянскі асветнік, вучоны, пісьменнік, перакладчык, мастак і графік эпохі Адраджэння. Нарадзіўся ў Полацку ў сям'і купца пры канцы 80-х гадоў XV стагоддзя. Першапачатковую адукацыю атрымаў у сваім родным горадзе, затым, вучыўся ў Вільні. У 1504-1506 гадах вучыўся на філасофскім факультэце Кракаўскага ўніверсітэта.**
- **У 1512 годзе ў Падуанскім універсітэце (Паўночная Італія) ён першы сярод усходніх славян атрымаў вучоную ступень доктара медыцыны. Як сведчаць даследнікі, Ф.Скарына не мог атрымаць годнасць доктара ва ўрачыстай абстаноўцы, бо ў яго не ставала грошай на раскошнае адзенне. Усёй раскошы ён здолеў супрацьпаставіць бліскучы інтэлект, і доктарская ступень была прысуджаная яму адзінагалосна. Яго незвычайным розумам і талентам захапляліся сучаснікі.**
- **Як чалавек шматграннага таленту, Ф.Скарына неўзабаве распачаў дзеля асветы свайго народа выдавецкую дзейнасць. 6 жніўня 1517 года ў чэшскай Празе пабачыла свет першая беларуская друкаваная кніга. За тры гады ён выдаў там 23 кнігі Бібліі ў сваім перакладзе на беларускую мову. Вярнуўшыся на радзіму, Ф.Скарына заснаваў у Вільні першую ў Беларусі друкарню і выпусціў тут яшчэ дзве кнігі - у 1522 і 1525 гадах.**

# Першадрукары Беларусі



- **Сымон Будны –** **гуманіст, асветнік, рэлігійны рэфарматар, філосаф, кнігавыдаўца. Паходзіў з сям'і дробнага шляхціца. Быў адным з самых адукаваных людзей свайго часу. Скончыў Кракаўскі універсітэт. У 1562 годзе з Нясвіжскай друкарні выйшла кніга Сымона Буднага " Катэхізіс", якая з'явілася адным з першых друкаваных выданняў на землях сучаснай Беларусі. Напісаны і выдадзены "Катэхізіс" на старабеларускай мове. Потым Будны друкаваў творы ў Бярэсці, Лоску, Вільні. Там ён выказваў свае меркаванні па праблемах веры, аб "мірскім" прызначэнні чалавека, аб дзяржаунай уладзе. Меў передавыя па тых часах погляды, якія распаўсюджваў разам са сваімі аднадумцамі і паплечнікамі Выступаў за ўсебаковае супрацоўніцтва славянскіх народаў.**

# Першадрукары Беларусі

- **Васіль Цяпінскі – беларускі гуманіст і радыкальна-рэфармацыйны дзеяч, кнігавыдавец, пісьменнік. Прадаўжальнік гуманістычных, культурна-асветніцкіх і патрыятычных традыцый Ф.Скарыны і С. Буднага. З 1578 года займаў пасаду падстарасты аршанскага. У радавым маёнтку Цяпіна заснаваў друкарню, дзе каля 1580 года выдаў перакладзенае на беларускую мову Евангелле з уласнай прадмовай, у якой ён выкладаў свае погляды. Цяпінскі выкрываў разбэшчанасць каталіцкіх і праваслаўных святароў, выступаў за маральную чысціню чалавека. Ён горача абараняў родную мову, гісторыю, традыцыі, быў адданым прыхільнікам пашырэння адукацыі сярод простага люду, адкрыцця школ на беларускай мове, выхавання самаахвярнага служэння Айчыне. Па палітычных і рэлігійных поглядах Цяпінскі быў блізкі С.Буднаму, хаця і належаў да больш памяркоўнага крыла рэфармацый нага руху.**



# Першадрукары Беларусі

- **Сімяон Полацкі** – паходзіў з Полацка. Вучыўся ў брацкай школе Богаяўленскага манастыра, затым – у праваслаўнай Кіева-Магілянскай калегіі. Выкладаў у брацкай школе ў Полацку. У 1664 годзе пераехаў у Маскву. З 1667 года працаваў настаўнікам царскіх дзяцей, у тым ліку і будучага расійскага імператара Пятра І. У 1679 годзе Сімяон надрукаваў "Буквар языка славенскага", а праз год – "Псалтыр рыфмаваную" Пасля сябе С.Полацкі пакінуў вялікую літаратурную спадчыну. У канцы 70-гадоў XVII стагоддзя ён арганізаваў і ўзначаліў Верхнюю друкарню ў Маскоўскім Крамлі. Сімяон быў таксама ініцыятарам стварэння і складання статута першай у Маскве вышэйшай адукацыйнай установы – Славяна-грэка-лацінскай Акадэміі. Сімяон Полацкі быў вялікім патрыётам беларусі, якую праслаўляў у сваіх творах. Ён унёс значны ўклад у развіццё беларускай і рускай культур.



# Першадрукары Беларусі




- **Мялецій Сматрыцкі** (свецкае імя Максім; 1575-1633), беларускі і ўкраінскі грамадска-палітычны і царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік-палеміст. Скончыў філасофскі факультэт Віленскай езуіцкай акадэміі. Удасканальваў веды ў Лейпцыгскім і Вітэнбергскім універсітэтах. З 1601 у маёнтках князя Б.Саламярэцкага на Магілеўшчыне і Меншчыне. У Віленскім праваслаўным брацтве зблізіўся з пісьменнікам-палемістам Л.Карповічам. Пісаў на старажытных беларускай і ўкраінскай, лацінскай, польскай мовах. Выступаў супраць Берасцейскай вуніі 1596. У 1608 супраць твораў І.Пацея выдаў «Антыграфіі...», у 1610 пад псеўданімам Тэафіла Артолага- кнігу «Трэнас» («Плач»), дзе ад імя праваслаўнай мацеры-царквы, якая сімвалізавала прыгнечаную радзіму, заклікаў беларускі і ўкраінскі народы да аб'яднання супраць каталіцкай экспансіі. У 1617 пад імем Мялецій пастрыгся ў манахі. Працаваў у школе віленскага Святадухаўскага брацтва, рэктарам Кіеўскай брацкай школы (1618-1620).

# Першадрукары Беларусі




- **Зізаній Лаўрэнцій** (Тустаноўскі; ?-1634), беларускі педагог-гуманіст, царкоўны дзеяч, мовазнавец, перакладчык. Брат С.Зізанія. Паходзіў з дробнамаянтковай беларускай шляхты. Адукацыю атрымаў у Астрожскай школе на Валыні. Працаваў настаўнікам царкоўнаславянскай і грэчаскай моў у Львоўскай (да 1592), Берасцейскай (1592-1595), Віленскай (1595-1597) брацкіх школах; у 1597-1618 хатні настаўнік у крычаўскага старосты Б.Саламярэцкага, князёў А.Астрожскага і Я.Карэцкага. У 1596 выдаў у Вільні першы ў Беларусі і на Украіне буквар «Наука ку читаню и розуменю писма словенского», які ўключаў «Лексіс...» - беларускі тлумачальны слоўнік (на 1061 слова), што аблягчаў разуменне старaславянскай мовы, набліжаў яе да жывой мовы народа. Яго «Грамматіка словенска совершенного искусства осми частиі слова...» (Вільня, 1596) напісана ў форме пытанняў і адказаў на царкоўнаславянскай і беларускай мовах. Граматыка і буквар мелі значны ўплыў на развіццё мовазнаўчай навукі ўсходніх славян, адкрывалі шлях да свецкай адукацыі. З 1619 ён - настаўнік у Кіева-Пячэрскай лаўры, перакладаў з грэчаскай мовы, рэдагаваў кнігі. У 1626 прывёз у Маскву напісаны па заданні патрыярха Філарэта «Катэхізіс» (выдадзены ў 1627, перавыдадзены ў Горадні 1783, 1787, 1788), дзе на беларускай мове выкладаў звесткі па прыродзе і даў блізкае да пратэстантызму тлумачэнне царкоўных догматаў. Яго погляды былі абвешчаны ерэтычнымі.

# Першадрукары Беларусі

- **Пётр Мсціславец (XVI ст)** Выхадзец з мяшчанаў, карэнны жыхар горада Мсціслаўля. Так здарылася , што амаль усё жыццё яму даводзілася быць “другім”. Пётр Цімафеевіч Мсціславец трапіў у Маскву, калі там ішла падрыхтоўка да стварэння друкарні і паўсюль адшукваліся ўмельцы, здатныя да “ізображенія кніг художественным тісненіем”. Так ён стаў дапамагаць Івану Фёдараву і па сутнасці меў справу з першадрукаваннем. Таленавітая праца Пятра Мсціслаўца, яго шрыфты і арнаменты былі заўважаны і ацэнены нават царом. У кнігах І.Федарава і П. Мсціслаўца, дзейнасць цара ўхвалялася, але з цягам часу, калі Іван Грозны ўзяў курс на жорсткасць і падаўленне ўсякага іншавер’я, Федараў і Мсціславец пакінулі Маскву і паехалі  ў Вялікае Княства Літоўскае. Гэта быў свайго роду пратэст. У Вільні наш суайчыннік абсталяваў друкарню ў доме купцоў Мамонічаў. З гэтага часу разыходзяцца шляхі І.Фёдарава і П. Мсціслаўца. Пачаўшы працаваць асобна, друкары паказалі, што, як майстры, яны вартыя адзін аднаго. У 1575 годзе П.Мсціславец выдаў Евангелле - першую працу, дзе яго прозвішча стаяла першым. Ён быў прыхільнікам асветы беларускага народа з дапамогай Слова. Але, у адрозненне сваіх суайчынікаў Буднага і Цяпінскага, аддаваў перавагу Слову старaславянскаму і ў гэтым была драма асобы ПятраМсціслаўуа.



# Першадрукары Беларусі

- **Кірыла Тураўскі**, вялікі гуманіст старажытнасці. Нарадзіўся каля 1130 г. у Тураве, там жа атрымаў і адукацыю. Тураў у той час быў магутным асяродкам культуры, у якім былі скрыпторыі(школы) пры манастырах, дзе вывучалі мовы, чыталі кнігі, знаёмілі вучняў з рыторыкай. Дасягнуўшы паўналецця К. Тураўскі стаў святаром. Пачаў пісаць малітвы, творы пра манахаў. Калі у 1148 г. сан Кіеўскага мітрапаліта атрымаў Кілім Смаляціч - ідэйна апанент Кірылы - Тураўскі замыкаецца ў манастырскай вежы - «стаўпе», робячы подзвіг стаўпніцтва. Гэты час даў яму мажлівасць для роздуму і пісання. Пасля таго, як Кілім склаў абавязкі мітрапаліта, Кірылу запрашаюць на епіскапскую кафедру. На схіле веку Кірыла Тураўскі пакінуў епіскапскую кафедру і пайшоў у Барысаглебскі манастыр, дзе працягваў пісьменніцкую дзейнасць да апошніх дзен свайго жыцця. Памёр ён пасля 1184 г.



# Першадрукары Беларусі

- **Ілья Капіевіч** (1651—1714) — кнігадрукар. Ураджэнец Мсціслаўшчыны. Адукацыю атрымаў у Слуцкай кальвініскай школе. З прычыны зямельных спрэчак з езуітамі мусіў пакінуць Радзіму. Месцам яго жыхарства стаў Амстэрдам, дзе Ілья заняўся кнігавыдавецтвам. Тут ён пазнаёміўся з маладым Пятром І. Па даручэнні цара падрыхтаваў і выдаў у 1699 г. у Амстэрдаме першы дапаможнік па матэматыцы на рускай мове. З пачатку XVIII ст. жыў у Маскве. Там Ілья Капіевіч выдаў першыя рускамоўныя падручнікі па граматыцы, рыторыцы і інш. Колькасць напісанага і надрукаванага Капіевічам уражвае — больш за 20 кніг. З іх дапамогай рускія людзі змаглі пазнаёміцца з багаццем еўрапейскай культуры і навукі.



# Першадрукары Беларусі

**Міхал Казімір АГІНСКІ**

- (1730 — 31 мая 1800, Варшава) — дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, кампазітар, паэт, мецэнат.
- Паходзіў з роду князёў Агінскіх, прадстаўнікі якога адыгрывалі значную ролю ў дзяржаўным, грамадска-палітычным і культурным жыцці ВКЛ і Польшчы. Рана страціў бацьку і гадаваўся пад апякунствам спачатку дзеда — вялікага гетмана літоўскага М.-С. Вішнявецкага, потым пад наглядам ваяводы віцебскага Марцыяна Агінскага, пасля яго выхавацелем стаў канцлер літоўскі Фрэдэрык Міхал Чартарыйскі.
- У 1768 М.К. Агінскі стаў вялікім гетманам літоўскім, а праз тры гады далучыўся да Барскай канфедэрацыі.
- Як мецэнат М.К. Агінскі рабіў ахвяраванні для кляштара і касцёла ў Смілавічах, а таксама заснаваў дабрачынны фонд для студэнтаў Віленскага ўніверсітэта. У кан. 1795 М.К. Агінскі пераехаў у Варшаву, дзе і правёў апошнія гады свайго жыцця.



# Беларусікая першаасветніца



**Ефрасіння Полацкая** (свецкае імя Прадслава; 1110?-1173), прадстаўніца хрысціянскага культурна-асветніцкага руху ў Полацкім княстве; першая жанчына ва ўсходнеславянскім рэгіёне, прылічаная да святых. Дачка князя Георгія Ўсяславіча, унучка полацкага князя Ўсяслава Брачыславіча (Чарадзея).Ефрасіння рана пастрыглася ў манахіні насуперак волі бацькоў. Пасяліўшыся ў келлі Сафійскага сабора, яна перапісвала творы рэлігійна-маральнага зместу. Ёсць меркаванні, што яна пісала летапісы і арыгінальныя творы. Ефрасіння заснавала ў Полацку жаночы і мужчынскі манастыры і была ігуменняй манастыра Святога Спаса. Яна была фундатарам пабудовы царквы Багародзіцкай і царквы Святога Спаса (узведзена каля 1160, цяпер Спаса-Ефрасіннеўская), дзе размяшчаліся келлі Ефрасінні і яе сястры.

# Ефрасіння Полацкая

- У канцы жыцця Ефрасіння здзейсніла паломніцтва ў Іерусалім, дзе і памерла. У 1178 яе мошчы перанесены ў Кіева-Пячэрскую лаўру, на пачатку 20 ст. - у Полацак.

- Яе дзейнасць - яскравы адбітак кардынальных духоўных зрухаў, што адбываліся ў культурна-грамадскім жыцці Беларусі на працягу 12 ст.Духоўны ўплыў выдатнай беларускай асветніцы далёка выйшаў за межы старажытнай эпохі. Яе імя, справы і вобраз падзвіжніцы крышталізаваліся ў часе і набылі найвышэйшую якасць неўміручага нацыянальнага сімвалу самааданага служэння сваёй радзіме.

Звесткі аб знакамітых беларусах і славутых людзях зямлі беларускай,  аб пачынальніках кнігадрукавання вы знойдзеце ў кнізе **Уладзіміра Бутрамеева “Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі”**, а таксама ў іншых выданнях  у нашай школьнай бібліятэцы.



# Дзякуем за ўвагу!



Прэзентацыю падрыхтавала загадчыца бібліятэкі Снненскай школы-інтэрната

Кручок К.У., 2017 г.